# Светлае свята — Каляды

21 декабря 2019

За вакном — шэрань і слата. А ў галерэі «Ракурс» Нацыянальнай бібліятэкі пануе чароўная атмасфера, якую стварылі працы мастака Рыгора Іванова.

Даведка.

Рыгор Іваноў — сябра Беларускага саюза мастакоў, заснавальнік аўтарскага напрамку. Па адукацыі — скульптар. Працы мастака знаходзяцца ў калекцыях многіх музеяў нашай краіны, а таксама ў прыватных калекцыях, у тым ліку і замежных.



Мяккае цяпло, якое літаральна выпраменьваюць карціны, далікатна атульвае, сагравае, закранае тонкія струны душы. Выстава «Калядныя званы» прымеркавана да, бадай, самага доўгачаканага свята — Каляд.

Каляды… Гэта смалісты водар лесу ў хаце ад прынесенай бацькамі прыгажуні ялінкі, нетаропкі і хвалюючы рытуал упрыгожвання лясной красуні, мігценне рознакаляровых гірлянд… Упэўнена, кожны ў дзяцінстве зачароўваўся сузіраннем у цемры мігцення агеньчыкаў на ялінцы, калі святло агеньчыка спачатку адбівалася на паверхні цацкі, потым знікала, і так паўтаралася неаднакроць. Усё вакол здавалася таямнічым, загадкавым… Верылася у цуды, якія адбываюцца менавіта ў калядную ноч… А з якім унутраным трымценнем сядзелася за калядным сталом, накрытым абрусам, з-пад якога кожны па чарзе выцягваў сцябліны пахкага сена… Узгадваюцца сполахі ценю ад свечкі на сценах. Незабыўны смак калядных страў — куцці, клёцак, бліноў, кісялю, квасу, узвару… Ясельки з немаўляткам Ісусам, куды

дарослыя гаварылі класці запіскі са зробленымі добрымі справамі ў час чакання Раства… Вельмі хацелася, каб іх было шмат. Так званая шопка ў храме з фігуркамі Марыі, Іосіфа, немаўляці ў атачэнні свойскіх жывёл, фігуркі пастухоў, мудрацоў, анёлаў. І… падарунак пад ялінкай.

Такія моманты ўсплылі ў памяці пад час сузірання твораў мастака. Карціны заварожваюць сваім флёрам загадкавасці, нават містычнасці, напаўняюць супакоем, ціхай радасцю. Іх можна разглядваць бясконца.

Упэўнена, аднойчы пазнаёміўшыся з творчасцю мастака, вы будзеце з лёгкасцю пазнаваць яго творы сярод дзясяткаў іншых. Званы, анёлы, чароўныя персанажы аўтарства Рыгора Іванова адметныя, пазнавальныя. Імпануе тое, што творы мастака выпраменьваюць святло, якое асацыіруецца з чысцінёй, дабром, гармоніяй, справядлівасцю…

Згадзіцеся, такія рэчы проста неабходны чалавецтву, асабліва зараз, калі хцівасць і крывадушша цемры імкнуцца завалодаць душамі людзей. Чамусьці злыя рэчы робяцца проста, а вось для добрых спраў трэба больш напружыцца. Сказаць дрэннае слова — лёгка, а вось пахваліць ці папрасіць прабачэння — ого, як цяжка… Украсці здаецца прасцей, чым зарабіць уласнай працай, падмануць — лепш, чым прызнацца…

У пэўным сэнсе выставу можна назваць тэрапеўтычнай — настолькі пазітыўна, станоўча яна ўплывае на яе наведвальнікаў. Хочацца стаць хоць крыху лепшым, мудрэйшым, філасофскі глядзець на мітусню штодзённасці. Дыялог атрымаўся. Судакрананне душ адбылося.



Не ўпусціце гэту магчымасць — зрабіць карысную справу для сябе, для сваёй душы, для сваіх дзяцей. Яны, між іншым, хутчэй прачытваюць коды мастацтва. Наведайце выставу «Калядныя званы» разам з сямейнікамі, сябрамі, абмяняйцеся ўражаннямі. І з чыстым сэрцам і светлымі думкамі сустрэньце Каляды!

Кацярына Іванова, фота аўтара

«Сляды на сцяне»